**М.Л.Кузьмініч**

# ЗАБЕСПЯЧЭННЕ СІСТЭМНАСЦІ Ў ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОЦЕ СА СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДДЗЮ

З набыццём статуса незалежнай дзяржавы Беларусь імкнецца да стварэння стройнай сістэмы маральнага, грамадзянска-патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення, што павінна забяспечыць вырашэнне складаных сацыяльна-эканамічных задач, якія стаяць перад краінай.

У перыяд карэннага рэфармавання грамадства напачатку 90-х гадоў дзяржава ўхілілася ад вырашэння выхаваўчых праблем і, як вынік, месца камуністычных ідэй у свядомасці людзей часам пачалі займаць каштоўнасці "дзікага" рынку і паўкрымінальнага свету. Для маладзёжнага асяроддзя характэрнымі сталі праявы бездухоўнасці, жорсткасці, насілля, сексуальнай уседазволенасці, наркаманіі і інш. На форуме моладзі Беларусі (верасень 1996 г.) у выступленні А.Р.Лукашэнкі было прызнана, што "у нас сёння няма якой-небудзь стройнай сістэмы маральнага, грамадзянска-патрыятычнага выхавання дзяцей, падлеткаў і моладзі".

Узнікла неабходнасць у хутчэйшым стварэнні новай сістэмы выхавання, якая грунтуецца на нацыянальных, маральных каштоўнасцях, на аб'яднанні намаганняў усіх сацыяльных інстытутаў, фарміраванні патрыятызму, грамадзянскай свядомасці.

У 1999 г. Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь сумесна з Нацыянальным інстытутам адукацыі была распрацавана Канцэпцыя выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь, у якой мэта выхавання вызначаецца як "станаўленне самастойнай, свабоднай, творчай асобы на аснове авалодання нацыянальна-культурнай спадчынай і агульначалавечымі каштоўнасцямі, раскрыцця схільнасцей і здольнасцей шляхам рэалізацыі сваіх патрэбнасцей".

Менавіта культура цывілізацый, якая мае шматэлементную будову (мастацтва, літаратура, мова, традыцыі, абрады, міфы, фальклор, спосаб развіцця народа), выступае ў якасці зместу выхавання. Пры гэтым нацыянальная культура разглядаецца як неад'емная частка сусветнай, далучэнне да якой магчымае толькі праз пазнанне сваёй нацыянальнай культуры. У цэнтр выхаваўчай сістэмы ставіцца чалавек як актыўная асоба, фарміраванне і развіццё якой залежыць у першую чаргу ад яе самой, яе самастойнасці і актыўнасці. Прызнана, што культурная спадчына перадаецца ад пакалення да пакалення не толькі праз падручнікі. Яна павінна стаць арганічнай

часткай жыцця чалавека і штодзённа ўзнаўляцца ў розных відах яго жыццядзейнасці.

Дзяржаўная палітыка Беларусі ў сферы адукацыі і выхавання грунтуецца на прынцыпах прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцей, нацыянальна-культурнай асновы адукацыі, гуманізму і дэмакратызму, адзінства навучання, духоўнага і фізічнага ўдасканалення, якое дапамагае цэласнаму развіццю чалавека, яго фізічных, сацыяльных і культурных сіл. Дзякуючы гэтаму адбываецца арганічнае спалучэнне асноўных элементаў светапогляду: ведаў, маральна-каштоўнасных арыентацый, эмацыянальна-паводзінскіх адносін і інш.

Арганізуючы функцыяніраванне выхаваўчай сістэмы навучальнай установы, важна аб'яднаць у адзінае цэлае ўсе віды вучэбна-выхаваўчай работы, намаганні ВНУ, сям'і з дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі ў стварэнні адкрытых выхаваўчых сістэм. Неабходна перайсці ад педагогікі эпізадычных мерапрыемстваў да сістэмнасці ў выхаваўчай рабоце з апорай на развіццё студэнцкай самадзейнасці і студэнцкага самакіравання.

Цэласнасць выхаваўчага працэсу праяўляецца як яго якасная характарыстыка, як унутраная ўзаемасувязь і адпаведнасць усіх кампанентаў, як сукупнасць і гарманічная адпаведнасць вонкавых і ўнутраных сувязей і адносін цэласнасці.

Інтэгруючым элементам педагагічнай сістэмы, які забяспечвае яе цэласнасць, з'яўляецца мэта. Падпарадкаванасць усіх кампанентаў, частак і функцый педагагічнай сістэмы асноўнай задачы – фарміраванню асобы чалавека – і складае сутнасць цэласнасці выхаваўчага працэсу. Такім чынам, цэласнасць педагагічнага працэсу ў ВНУ можна разглядаць як накіраванасць усіх кампанентаў выхаваўчай сістэмы на агульнае і прафесійнае развіццё асобы будучага спецыяліста, як гарманічнае ўзгадненне мэты, сродкаў, формаў і метадаў выхаваўчага працэсу.

У сучасных умовах працэс выхавання ВНУ набывае новыя характэрныя рысы. Важнай задачай вучэбна-выхаваўчага працэсу становіцца арганізацыя не фармальнага засваення тэарэтычных ведаў, уменняў і навыкаў, а развіццё асобы студэнта, яго каштоўнасных арыентацый і ўстановак. Яе рэалізацыя магчымая на аснове культуралагічнага падыходу, праз засваенне ўсёй сукупнасці каштоўнасцей, створаных чалавецтвам. Менавіта агульначалавечыя каштоўнасці (грамадзянскія, сацыяльныя, нацыянальныя, асобасныя) знаходзяцца ў цэнтры ўвагі педагогаў. Праз засваенне гэтых каштоўнасцей ляжыць шлях да фарміравання асобы будучага спецыяліста.

Спецыфіка выхаваўчай сістэмы вызначаецца яе прызначэннем. Мэтай працэсу фарміравання асобы спецыяліста ў ВНУ з'яўляецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

культурна-асобасны, прафесійны склад чалавека. Цэласная асоба выпускніка разглядаецца як вынік яго агульнай і прафесійнай падрыхтоўкі. Вылучэнне агульнага і прафесійнага ў развіцці асобы носіць адносны характар. Тут важна тое, што агульнае выступае як цэлае, часткай якога з'яўляецца прафесійнае. У аснове ўзаемаадносін гэтых бакоў падрыхтоўкі спецыяліста ляжыць дыялектычнае адзінства часткі і цэлага.

У сваім развіцці працэс фарміравання асобы спецыяліста мае тры асноўныя перыяды, на кожным з якіх вырашаюцца свае спецыфічныя выхаваўчыя задачы: дауніверсітэцкі, універсітэцкі і пасляуніверсітэцкі. Адпаведна праграма выхаваўчай работы ВНУ павінна ўключаць наступныя раздзелы.

1. Работы па прафесійнай арыентацыі сярод выпускнікоў сярэдніх школ, ліцэяў, каледжаў, сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

2. Выхаваўчая работа са студэнтамі ў час іх навучання.

3. Работа з выпускнікамі універсітэта.

У час універсітэцкай падрыхтоўкі студэнт праходзіць некалькі этапаў свайго станаўлення:

- этап адаптацыі да ўмоў навучання ва універсітэце (I курс);

- этап фарміравання базісу будучай прафесійнай дзейнасці, асобаснага самавыражэння (II-III курсы);

- этап вузкапрофільнай падрыхтоўкі да прафесійнай дзейнасці і вызначэння будучага месца працы ці сферы навукова-педагагічнай дзейнасці (IV-V курсы).

На кожным з пазначаных этапаў агульнага і прафесійнага развіцця асобы студэнта рэалізуецца цэласная праграма выхавання студэнцкай моладзі, якая ахоплівае:

а) асноўныя сферы жыццядзейнасці студэнтаў: вучэбную, бытавую, грамадскую, вольнага часу;

б) асноўныя напрамкі выхаваўчай дзейнасці: грамадзянскае выхаванне, маральнае, працоўнае, фізічнае, эстэтычнае;

в) працэсы самавыхавання, самаадукацыі, самаразвіцця асобы студэнта.

Працэс авалодвання грамадскім вопытам адбываецца ў ВНУ ў ходзе арганізаванай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў. Менавіта таму фарміраванне прафесійнай культуры будучага спецыяліста становіцца важным напрамкам выхаваўчай работы ва універсітэце: у ходзе навучальна-пазнавальнай дзейнасці адбываецца працэс развіцця асобы студэнта.

Асновай сацыяльнай арыентацыі студэнцкай моладзі, навуковага разумення ёю сутнасці і характару прафесійнай дзейнасці з'яўляецца светапогляд асобы. Сістэма навуковых ведаў, уяўленняў, перакананняў і поглядаў на грамадства і прыроду, сістэма адносін да



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

іншых людзей і самога сябе вызначае каштоўнасныя арыентацыі чалавека. Задача выхаваўчай сістэмы – перавесці навуковыя веды і сацыяльныя ідэі ва ўнутраныя дамінанты дзейнасці асобы, дабіцца, каб веды сталі перакананнямі, а перакананні рэалізаваліся ў паводзінах і звычках студэнцкай моладзі.

У працэсе пабудовы незалежнай Беларусі паўстала задача фарміравання ў грамадзян рэспублікі дзяржаўнай ідэалогіі, засваення імі норм і правілаў сацыяльных паводзін, ведаў аб грамадстве і палітыцы, якія вызначаюць жыццё ва ўмовах суверэннай, прававой, дэмакратычнай краіны. Грамадзянскае выхаванне ўключае перадачу студэнтам палітыка-прававых ведаў, фарміраванне асобасных адносін да сваёй дзяржавы, да сацыяльных і нацыянальных груп насельніцтва. Фарміраванне грамадзяніна спалучае ў сабе элементы палітычнага, прававога і маральнага выхавання. Выхаванне грамадзянскасці неаддзельна ад выхавання патрыятызму, пачуцця гонару за Радзіму, павагі да дзяржаўнай і гістарычнай сімволікі, усведамлення гераічнага мінулага, асэнсавання ўзроўню дэмакратычнасці сучаснай краіны, забяспечанасці правоў, свабод і дабрабыту яе грамадзян.

Патрыятычнае выхаванне студэнцкай моладзі пачынаецца з выхавання пачуцця гонару за свой універсітэт, свой горад, сваю Айчыну. Яно не абмяжоўваецца выхаваннем толькі на прыкладах гераічнага мінулага, непадуладнае палітычнай кан`юнктуры. Зместам нацыянальнага патрыятызму з'яўляецца беларуская нацыянальная культура: родная мова, гісторыя народа, яго традыцыі, абрады і фальклор, спосаб жыцця беларусаў, іх дасягненні.

У сувязі з гэтым актуальным з'яўляецца ўкараненне ў праграму выхаваўчай работы каляндарнай абрадавасці, стварэнне ва універсітэце атмасферы беларускасці. Выпускнік павінен быць нацыянальна свядомым дзеячам культуры, арганізатарам мастацкай творчасці, здольным да патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення з выкарыстаннем мастацкай спадчыны, праз развіццё творчых здольнасцей дзяцей, іх далучэнне да народнай гісторыі, праз засваенне традыцый, усведамленне менталітэту беларусаў.

Самым вялікім культурным дасягненнем чалавечай цывілізацыі з`яўляюцца хрысціянскія каштоўнасці, якія павінна засвоіць моладзь. Святкаванне такіх дзяржаўных дат, як Нараджэнне Хрыстова, Вялікдзень, Дзяды, Радаўніца, трэба скіраваць на фарміраванне ў студэнцкай моладзі ўстойлівых маральных якасцей і патрэбнасцей, на засваенне норм і прынцыпаў грамадскай маралі.

Умацаванне здароўя студэнтаў з'яўляецца дзейсным фактарам павышэння прадукцыйнасці іх вучэбна-пазнавальнай, грамадскай і мастацка-эстэтычнай дзейнасці ва універсітэце, зарукай эфектыўнай працы на карысць краіны пасля заканчэння ВНУ. Таму фізкультурна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аздараўленчая работа з'яўляецца важным напрамкам выхаваўчай работы.

Эстэтычнае выхаванне студэнтаў ва універсітэце культуры з'яўляецца састаўной часткай фарміравання прафесійнай культуры будучых спецыялістаў у сферы культуры і мастацтва.

Комплексны падыход да выхавання асоб азначае адзінства ўсіх напрамкаў выхаваўчай работы, каардынацыю разнастайных яе формаў і метадаў. Усе дзеянні арганізатараў выхаваўчага працэсу скіраваны на агульнае і прафесійнае развіццё студэнтаў, на падрыхтоўку іх да жыцця ў якасці грамадзян, прафесіяналаў, фізічна здаровых асоб.

**Т.О. Демьянчук**
**(г. Ровно)**

## ОСОБЕННОСТИ ФОРМИРОВАНИЯ НРАВСТВЕННОСТИ СТУДЕНТОВ МЕДИЦИНСКИХ ВУЗОВ

Специфика деятельности современного медицинского работника вносит свои коррективы в воспитательную работу с будущим медицинским персоналом, который обучается в медучилищах и колледжах. Здесь большое значение должно придаваться не только приобретению студентами глубоких и всесторонних знаний, но и воспитанию чувства ответственности и профессионального долга. Поэтому воспитательные мероприятия, которые проводятся во внеурочное время среди студентов медицинских вузов, должны содержать ценности особенно высокого порядка. Важно и то, что нравственные ценности в медицине, в отличие от других наук, вплетаются в те приемы и методы, которые медработники используют для исцеления больного. Медик должен исполнять свой гуманистический долг на каждом этапе своей практической деятельности, поскольку ее объектом является человек.

Воспитательную работу в медицинских вузах I-II ступени аккредитации надо суметь поставить так, чтобы в результате формирования у студентов стойкой внутренней потребности совершенствовался не только ум, но и эмоции. Только при таком подходе к воспитанию личности будущего медработника можно создать надежную опору, стержень его духовного богатства и настоящую человечность, без каких невозможна медицина. Допустим, что студент хорошо освоил естественнонаучную теорию человека, знает о том, что эта теория наполнена нравственным содержанием, ценностным подходом к здоровому и больному человеку. Но это еще не означает, что принципы медицины в их гуманистическом измерении стали уже системой личностных взглядов и ориентаций студента, которыми он руководствуется в жизни. Поэтому в процессе усвоения принципов медицины во внеурочное время необходимо добиться того, чтобы знания студентов



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ